**Тарасевіч К.Т. (Мінск, Беларусь)**

## Дызайн вокладак выданняў Максіма Танка

М. Танк напраўду лічыцца адным з самых прадуктыўных беларускіх класікаў: толькі пры ягоным жыцці было выдадзена каля 20 паэтычных зборнікаў, не ўлічваючы кніг выбраных вершаў, трох збораў твораў, выданняў паэзіі для дзяцей і казак, успамінаў і перакладаў. Яго кнігі выдаюцца і перавыдаюцца ужо на працягу 80 гадоў, а творчасць ахоплівае тры гістарычныя эпохі. У афармленні зборнікаў Танкавай паэзіі ўдзельнічалі найлепшыя беларускія мастакі: У. і М. Басалыгі, А. Кашкурэвіч, А. Лісічнікаў і інш. Таму вывучэнне досведу афармлення вокладак кніг М. Танка будзе карысным для айчыннага кнігадруку, бо яно дапаможа павысіць эфектыўнасць рэпрэзентатыўнай функцыі беларускай кнігі і выпрацаваць дасканалую стратэгію па папулярызацыі сённяшніх перавыданняў беларускай класікі.

Станаўленне паэтычнага голасу М. Танка адбывалася ў складаных умовах. Па выніках савецка-польскай вайны 1920 г. наша краіна страціла вялікую плошчу зямель. Улады Заходняй Беларусі (менавіта такі тэрмін ужываўся для апісання новай часткі Польшчы) пачалі актыўна праводзіць палітыку па знішчэнні беларускага нацыянальнага руху. Аднак, нягледзячы на іх захады, Беларускі нацыянальны камітэт у Вільні да 1938 г. працягваў каардынаваць дзейнасць заходнебеларускіх грамадскіх арганізацый і ўстаноў [3, с. 362]. Нелегальна невялікімі накладамі ўсё ж з'яўлялася якасная літаратура, аформленая ў традыцыях нашаніўскага перыяду. Вокладкі кніг М. Танка таго часу альбо ўвогуле не ўтрымлівалі ілюстрацыйных элементаў (“Нарач”, 1937, часопіс “Калоссе”; “Пад мачтай”, 1938, выдавец Рыгор Шырма), альбо імкнуліся як мага глыбей раскрыць сімволіку надрукаваных вершаў. Так, на вокладцы першага Танкавага зборніка “На этапах” (1936) быў змешчаны малюнак Міхала Сеўрука (ён жа з'яўляецца афармляльнікам многіх беларускіх кніг пачатку XX ст.), які не толькі глыбока, таленавіта перадаваў унутраны і ідэйны сэнс Танкавай паэзіі, але і даваў сінтэзаваны вобраз Заходняй Беларусі перыяду рашучага наступу рэакцыі. Паліцэйскі штык над дахамі вёсак, над шляхамі сімвалізаваў няволю і бяспраўе [2, с. 16]. У 1937 г. пабачыў свет зборнік вершаў “Журавінавы цвет”. Афармленнем вокладкі займаўся вядомы мастак Язэп Горыд. Ён імкнуўся перадаць маладую сілу, буйнасць, глыбіню паэзіі аўтара праз вобраз “п'янага” сонцам і дажджом залатога калосся. У дадатак, пад малюнкам Горыд дэкаратыўна раскідаў крыху стылізаваныя кветкі журавін. Кампазіцыю вырашыў у трох колерах: чорным, жоўтым і чырвоным (дамінуючым). Аднак у паэзіі Танка журавінавы колер быў сімвалам барацьбы: “Журавініць песняй Беларусь” – уздымаць людзей на змаганне, сеяць ідэі сацыялістычнай рэвалюцыі. Таму агульны знешні мастацкі выгляд кнігі ўсё ж застаўся недастаткова выразным. Нездарма выклікаў у Максіма Танка лёгкую скруху. “Вокладка мне не вельмі падабаецца, хоць і рабіў яе наш выдатны мастак Горыд”, – запісаў аўтар зборніка ў дзённіку ад 26 ліпеня 1937 г. [3, с. 67].

17 верасня 1939 г. савецкія войскі пачалі вызваленне Заходняй Беларусі. Ужо напрыканцы месяца ўсе раней страчаныя землі былі далучаныя да БССР. У перыяд

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

з 1939 па 1991 гг. кнігі Максіма Танка паспяхова выдаваліся ў тагачасных дзяржаўных выдавецтвах.

Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны М. Танк паспеў выдаць толькі адзін зборнік: “Выбраныя вершы” (1940, Дзяржаўнае выдавецтва пры СНК БССР). Ён быў афармлены даволі густоўна: цёмна-зялёны пераплёт, на пярэдняй частцы якога былі выцісненыя імя аўтара (прапіснымі вялікімі літарамі чырвонага колеру), назва кнігі (светла-зялёнага колеру, прапіснымі літарамі меншага памеру), выдавецкая арганізацыя (літарамі такога ж памеру, як і назва, бясколерная), а таксама выява дрэва пры дарозе (спалучэнне светла-зялёнага і бэжавага колеру).

У 1941–1945 гг. М. Танк актыўна ўдзельнічаў у ваенных дзеяннях, таму не публікаваўся.

Пасля Вялікай Перамогі краіна апынулася ў цяжкім эканамічным становішчы: разбураны амаль усе прамысловыя прадпрыемствы, маёмасць калгасаў і саўгасаў разрабавана, знішчана матэрыяльная база адукацыі, навукі, культуры. Аднак усё ж працягваўся выпуск кніг, мэтай якіх быў уздым жыхароў СССР на аднаўленне былой велічы дзяржавы. У першыя два гады пасля вайны свет пабачылі адразу тры кнігі паэзіі М. Танка: “Вастрыце зброю” (1945), “Праз вогненны небасхіл” (1945) і “Вершы” (1947). Іх аб’ядноўвала сціпласць афармлення: мяккая вокладка, адсутнасць адметных паліграфічных элементаў, мінімальнае ілюстраванне (так, у першых двух зборніках выяўленчыя элементы займалі не больш за 1/4 усёй плошчы тытульнай часткі вокладкі, у трэцім зборніку – адсутнічалі ўвогуле). Усе кнігі былі выдадзены ў Дзяржаўным выдавецтве БССР.

З 1947 г. кнігі М. Танка выдаваліся пераважна ў цвёрдым пераплёце, мастацкаму афармленню і паліграфічнаму выкананню надавалася ўсё большая ўвага. У 1948 г. выйшаў зборнік “Каб ведалі” – першая кніга паэта з супервокладкай і цісненнем золатам на тытульнай частцы пераплёту. Супервокладка выконвала, хутчэй, мастацкую функцыю, бо імя аўтара і назва твора былі змешчаны і на пераплёце. У 1950-ыя гг. выкарыстанне ў афармленні кніг ціснення розных колераў стала агульнай тэндэнцыяй. Менавіта гэтая мастацкая тэхніка характэрна для зборнікаў М. Танка 1951, 1954 і 1957 гг. Колерам вылучаліся імя аўтара і назва твора, усе астатнія элементы кампазіцыі былі бясколернымі. У афармленні пераважалі прыродныя матывы, увасобленыя ва ўзорах, рамках і арнаментах.

У першай палове 1960-х гг. кнігі М. Танка выходзілі ў мініяцюрным фармаце і вылучаліся высокай якасцю: ва ўсіх зборніках выкарыстоўвалася цісненне, выданні 1962 і 1964 гг. мелі супервокладку, прычым, у адрозненне ад 1948 г., яна была неабходнай часткай выдання, бо ўтрымлівала імя аўтара і назву кнігі, адсутныя на тытульнай частцы пераплёту (ідэнтыфікаваць зборнік без супервокладкі можна было толькі па імені аўтара на карашку). Афармленне вокладак у такіх кнігах было сціплым, сімвалічным, з выкарыстаннем прыродных элементаў: пейзажу, асобнай кветкі ці галінкі дрэва.

З другой паловы 1960-х гг. выкарыстанне нестандартных фарматаў становіцца, хутчэй, выключэннем з правіла. Зніжаецца папулярнасць супервокладкі: да 1990 г. яна

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

стане часткай канструкцыі толькі 4 выданняў вершаў М. Танка і будзе факультатыўным элементам, бо імя аўтара і назва кнігі будуць змешчаны на тытульнай частцы пераплёту і карашку. У афармленні кніг, акрамя прыродных, з’яўляюцца народныя матывы (у тым ліку, у тэхніцы выцінанкі –1972 г.), абыгрываецца тэма паэта і паэзіі (пяро на вокладцы зборніка 1976 г.), кахання (1979, 1980 гг.). Амаль ва ўсіх кнігах выкарыстоўваецца цісненне на пераплёце. Мастацкае афармленне некаторых выданняў 1980-х гг. абмяжоўваецца гульнёй з тыпаграфікай (1984, 1989).

Афармленне выданняў М. Танка паслясавецкага перыяду вылучаецца сваёй сціпласцю: ілюстрацыі выкарыстоўваюцца толькі ў зборніках у межах серый (1990, 2003, 2012 гг.) і ў зборы твораў у 13 т. (2006–2012), у астатніх выданнях акцэнт робіцца на гульні са шрыфтамі, іх памерам, спалучэннем з дадатковымі элементамі (віньеткамі, лагатыпам і інш.), незвычайным размяшчэннем імя аўтара і назвы кнігі на вокладцы (перпендыкулярна ці пад вуглом). Змяншаецца папулярнасць ціснення: пасля 1993 г. яно выкарыстоўваецца толькі пры афармленні найбольш значных выданняў: вялікіх збораў твораў. У 1994–1996 гг. кнігі М. Танка выходзяць у мяккай вокладцы ў фармаце покетбук, аднак такі тэрмін на беларускай кніжнай прасторы з’явіцца значна пазней – у 2012 г., калі ў выдавецтве “Логвінаў” пабачыць свет зборнік са ста выбранымі вершамі паэта – “Абвяржэнне”. Дызайн вокладкі дадаткова раскрывае сэнс назвы, а таксама, у нейкай ступені, мэту выдання (аўтар ідэі Тарас Куба): дзве тлустыя сінія лініі на белым фоне (міжвольна ўзнікае асацыяцыя з андрэеўскім крыжом, але ў дадзеным кантэксце яна выпадковая), кніга нібыта перакрэслена. “Андрэй браў тэксты, якія прэзентуюць Танка-філосафа, Танка-лірыка, у якіх няма ні слова пра партыйныя білеты ці камунізм, – кажа Валянцін Акудовіч. – Максім Танк, не зважаючы на адданасць камуністычным ідэалам, – гэта сапраўды нацыянальны паэт. Па-другое, ён быў вельмі еўрапейскім паэтам і, па-трэцяе, Танк быў першым пасляваенным паэтам-інтэлектуалам. Гэта яго вельмі вылучала сярод іншых паэтаў, якія не змаглі адысці ад вясковых каранёў” [4]. Такія якасці і імкнуўся падкрэсліць укладальнік. Таму зборнік атрымаў назву “Абвяржэнне”.

Такім чынам, выданне твораў айчыннай класікі, у тым ліку М. Танка, заўсёды было адным з прыярытэтных накірункаў развіцця нашых выдавецтваў усіх формаў уласнасці. Нават у цяжкія часы знаходжання ў складзе Польшчы, калі творы беларускіх аўтараў забараняліся, у пасляваенны перыяд, калі матэрыяльная база краіны была фактычна знішчана, невялікімі накладамі, у сціплым выкананні ўсё ж выдавалася якасная літаратура. У афармленні зборнікаў М. Танка мастакі для раскрыцця праблематыкі твораў актыўна выкарыстоўвалі сімвалізм прыродных элементаў, імкнуліся падкрэсліць нацыянальную прыналежнасць праз народныя матывы, аўтэнтычныя тэхнікі (выцінанка); актыўна выкарыстоўвалі магчымасці тэкставых і дадатковых элементаў (віньетак, лагатыпаў, падкрэсліванняў) у пабудове запамінальных шрыфтавых кампазіцый. Для надання кнізе элітарнасці, падкрэслівання значнасці змешчаных твораў выкарыстоўваліся магчымасці паліграфіі: цісненні, у тым ліку срэбрам і золатам, мініяцюрныя фарматы і фармат покетбук. У савецкія часы ў канструкцыю зборніка ўключалі супервокладку, аднак

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

цяпер у выданнях літаратурнай класікі яна амаль не сустракаецца. Між тым, супервокладка значна падоўжыць тэрмін службы кнігі, захавае пераплёт ад пашкоджанняў, а таксама дапаможа афарміцелю напоўніцу раскрыць патэнцыял выдання.

Варта адзначыць, што пераважная большасць выданняў М. Танка выходзіла і працягвае выходзіць у цвёрдым пераплёце і стандартным фармаце, нягледзячы на еўрапейскую тэндэнцыю павелічэння на рынку колькасці “покетбукаў” у мяккай вокладцы. Гэта сведчыць пра недавер чытачоў да мяккай вокладкі, магчыма, таму, што яна дыскрэдытавала сябе ў пачатку 1990-х гг., калі ў такім выглядзе выходзіла бульварная, няякасная літаратура [5, с. 846]. Так, напрыклад, пасля выхаду кніг серыі “Мая беларуская кніга” некаторыя пакупнікі выказвалі жаданне набыць любімыя кнігі ў цвёрдым пераплёце [6].

Літаратура


1. Арлоў, У. Краіна Беларусь. Вялікае княства Літоўскае : ілюстраваная гісторыя / тэкст У. Арлоў; мастак З. Герасімовіч. – Bratislva : Kalligram, 2012. – 397 с.
2. Ліс, А. Пётра Сергіевіч / А. Ліс. – Мінск : Навука і тэхніка, 1970 – 88 с.
3. Ліс, А. Пякучай маланкі след / А. Ліс. – Мінск : Маст. літ., 1981. – 116 с.
4. Мікулевіч, С. «Абвяржэнне» Максіма Танка / С. Мікулеві [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://budzma.by/news/abvyarzhenne-maksima-tanka.html. – Дата доступу : 28.06.2014.
5. Передний, Д. М. Реклама: место в оформлении книги / Д. М. Передний // Электронный научный журнал «Исследовано в России» [Электронный ресурс]. –Режим доступа : http://zhurnal.ape.relarn.ru/articles/2005/081.pdf. – Дата доступа : 02.02.2016.
6. «Дзікае паляванне караля Стаха» Владимир Короткевич // Издательство Попурри на OZ.by [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://oz.by/books/more10442037.html. – Дата доступа : 02.02.2016.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ